Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

17 ЛІСТАПАДА 2015 г. АЎТОРАК № 222 (28080) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Гандлёвыя традыцыі Беларусі**

СТАР. 4



**Свет пасля 13 лістапада**

СТАР. 5

СОЮЗ ЕВРАЗИЯ



**Саюзная падтрымка маладзёжных інавацый**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Тарас НАДОЛЬНЫ, намеснік старшыні праўлення Нацбанка:**

*«Рэалізацыя дэкрэта №7 «Аб прыцягненні грашовых сродкаў ва ўклады (дэпазіты)» дазволіць у перспектыве банкам зрабіць больш таннымі стаўкі па крэдытах, таму што яны будуць дакладна разумець, які аб'ём ліквіднасці на зваротнай аснове яны павінны трымаць, а які — на адзыўной. Гэта прывядзе якраз да зніжэння ставак грашовага рынку з боку і крэдытаатрымальніка. І, безумоўна, дазволіць знаходзіць дадатковыя крыніцы для фінансавання цікавых, эфектыўных камерцыйных праектаў».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 17.11.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 17889,00 | ▲ |
| Еўра | 19219,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 269,17 | ▲ |
| Укр. грыўня | 769,75 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# ЭХ, ДАЖЫНАЧКІ...

**Абласныя святы працаўнікоў вёскі «Дажынкі-2015» прайшлі ў Вілейцы, Ельску і Дзятлаве**



На Дажынках у Вілейцы.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**Сёлета падвядзенне вынікаў сельскагаспадарчага года супала з прафесійным святам аграрыяў краіны — Днём працаўнікоў сельскай гаспадаркі і перапрацоўчай прамысловасці аграпрамысловага комплексу.**

**«Здаўна хлебаробы пасля завяршэння асноўных работ на зямлі святкавалі дажынкі як вянец напружанай працы. Ад таго, які ўраджай сабраны з палёў, колькі хлеба паступіла ў засекі, залежала жыццё да наступнай гарачай пары, — адзначыў на «Дажынках» у Вілейцы старшыня Мінаблвыканкама Сямён ШАПІРА. — Хлеб для славян — святыня, невыпадкова беларусы клалі яго ў якасці абярэга ў калыску нованароджанага, бралі з сабой у далёкую дарогу, а жаніха і нявесту бацькі сустракалі на парозе хлебам-соллю. Так склалася, што менавіта за цэнтральным рэгіёнам ужо даўно замацавалася рэпутацыя галоўнай жытніцы: тут самы высокі валавы збор збожжа ў краіне».**

## ХЛЕБАРОБЫ НЕ ПАДВЯЛІ

**Прыгожа аздобленыя вясковыя дворыкі з багатай сельгаспрадукцыяй, вырабамі народных умельцаў, якія арганізоўваў падчас свята кожны раён Міншчыны, сведчаць пра тое, што справы ў цэнтральным рэгіёне ладзяцца. Ёсць што паказаць гасцям, ёсць чым і пачаставаць.**

І сапраўды так. На самым вялікім з каравааў, што дэманстраваўся падчас выставы, — лічбы 2 млн 177 тысяч тон. Менавіта столькі сабралі збожжа на Міншчыне. Сярэдняя ўраджайнасць збожжавых і зернебабовых склала 41,5 цэнтнера з гектара, што на 2 цэнтнеры вышэй за агульнарэспубліканскі паказчык.

Для старшага камбайнера агракамбіната «Ждановічы» Віктара Стэльмаха сёлетняя ўборка 10-я па ліку, ён двойчы быў пераможцам на рэспубліканскім свяце працаўнікоў сяла «Дажынкі». Сёння Віктар Васільевіч найлепшы не толькі ў вобласці, але і ў краіне — яго вынік 7 тысяч 442 тоны збожжа. Вадзіцель Міхаіл Салавей з СВК «Пагосцкі» Бярэзінскага раёна на старэнькім аўтамабілі «ГАЗ-53» зрабіў 441 рэйс, перавёз 1600 тон збожжа і стаў абсалютным пераможцам у вобласці.

Зусім не жаночую спецыяльнасць — інжынер сельскагаспадарчай вытворчасці — выбрала Анастасія Кузьміна і зусім рэдкую пасаду для жанчыны заняла ў гэтым годзе — старшыня адкрытага акцыянернага таварыства «Камена» Лагойскага раёна. Упершыню сёлета гаспадарка атрымала збожжавых 36 цэнтнераў з гектара, што амаль на 12 цэнтнераў больш, чым у мінулым годзе. Такой ураджайнасці не было за ўсю гісторыю існавання гэтай гаспадаркі. Старшыня Мінаблвыканкама ўручыў Анастасіі Георгіеўне сертыфікат на 1 млрд рублёў для набыцця сельскагаспадарчай тэхнікі. Такія ж сертыфікаты атрымалі і іншыя кіраўнікі сельгасарганізацый.

СТАР. 3

■ Надвор'е

## ХОЛАДАМ І НЕ «ПАХНЕ»

**Большую частку тыдня сярэдняя тэмпература паветра будзе на 3-8 градусаў вышэйшай за норму**

**У найбліжэйшы час тэрыторыя краіны трапіць пад уплыў актыўных атлантычных цыклонаў, якія выходзяць на заходняе ўзбярэжжа Скандынаўскага паўвострава і адначасова павольна прасоўваюцца на ўсход. Аб гэтым паведаміў начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Дзмітрый РАБАЎ.**

У аўторак удзень на большай частцы тэрыторыі прагназуюцца дажджы, раніцай месцамі магчымы мокры снег. Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе плюс 3-8 градусаў, па паўднёвым захадзе да 10 цяпла. І ў сераду да нас завітае чарговая хваля атмасферных франтоў, што прынясе ў краіну цёплую вільготную паветраную масу і дажджы з Цэнтральнай Атлантыкі. Уначы і раніцай месцамі туман. Уначы чакаецца 2-9 цяпла, удзень — плюс 6-13 градусаў.

Не чакаецца істотнага пахаладання і ў чацвер, аднак дыскамфорту нам дабавіць парывісты заходні вецер. Часам будзе ісці дождж і прагназуецца ўзмацненне ветру парывамі да 15-18 м/с. Тэмпература паветра ўначы складзе 3-8 цяпла, удзень будзе плюс 5-10 градусаў. У пятніцу і суботу праз тэрыторыю Беларусі пройдзе яшчэ адзін атлантычны цыклон, які рухаецца на Фінскі заліў. Ён сфарміруе ў гэтыя дні ветранае і дажджлівае надвор'е. Прычым калі ў пятніцу на працягу сутак чакаецца ад 2 да 10 цяпла плюс безупынныя дажджы, то ў суботу на большай частцы Беларусі пройдуць кароткачасовыя дажджы, а ў асобных раёнах магчымы мокры снег. Уначы на суботу месцамі ўзмацненне ветру парывамі да 15-18 м/с, а тэмпература паветра на працягу сутак знізіцца да 1-7 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*